крыніца не толькі часткі культурнай спадчыны краіны, але і духоўнай, якой з даўніх часоў надавалася асаблівае значэнне.

Літаратура:
1. Свята-Крыжаўзвіжацкая Царква [Электронны рэсурс]. – Рэжым доступу: https://vetliva.ru/belarus/what-to-see/krestovozdvizhenskaya-tserkov-v-derevne-zhirovichi/. – Дата доступу: 22.09.2024.
2. Крестовоздвиженская церковь в деревне Жировичи [Электронны рэсурс]. – Рэжым доступу: https://www.holiday.by/by/skarb/15-krestovozdvizhenskaja-cerkov-v-derevne-zhirovichi. – Дата доступу: 22.09.2024.

# КРЫЖ ЯК СІМВАЛ ВЕРЫ: ГІСТОРЫЯ ЎЗВЯДЗЕННЯ КРЫЖА Ў ВЁСЦЫ САМАРАВІЧЫ

**Серык Г. В.**

Гродзенскі дзяржаўны медыцынскі ўніверсітэт
г. Гродна, Рэспубліка Беларусь
Навуковы кіраўнік – Сняжыцкая А. С.

У верасні 2024 года, працуючы над дадзенай тэмай, было праведзена апытанне людзей featureознага ўзросту (ад 10 да 80 гадоў). На пытанне “З чым у вас асацыіруецца крыж?”, самым папулярным адказам было слова “вера”. Так адказалі 30 з 35 рэспандэнтаў (85.7%).

Самым старажытным сімвалам чалавецтва з’яўляецца крыж. Стаўраграфія – гэта навука, якая вывучае ўсе тыпы, формы крыжоў, асаблівасці іх вырабу, установкі і выкарыстанне ў жыцці і абраднасці людзей. З крыжам звязаны легенды, міфы і паданні, яго выкарыстоўвалі ў абрадах, вышывалі на арнаментах і малявалі на карцінах і гербах, чаканілі на манетах, насілі на шыі і благаслаўлялі ім на розныя перыяды жыцця. Само слова “крыж” з лацінскага азначае “дрэва, шыбеніца або іншыя драўляныя прылады для пакарання смерцю”. Зараз крыж выступае ў якасці двух выяў: як прадмет мастацтва і як рэлігійная частка жыцця чалавецтва [1].

Па словах мясцовых жыхароў, гісторыя ўстанаўлення крыжа ў вёсцы Самаравічы звязана з вельмі цікавай легендай. Здарылася гэта ў 1997 годзе, калі па вёсцы ездзілі збіраць малако. Мясцовая жанчына ехала на доўгім возе і бралася бліжэй да абочыны, каб нікога не зачапіць. Удалечыні насустрач рухалася машына, таму яна пад’ехала яшчэ бліжэй да таго месца, дзе калісьці стаяў крыж. Ён быў устаноўлены ў тым месцы, дзе ў часы Вялікай Айчыннай вайны размяшчаўся ваенны гарнізон, і дзе чынілі свае зверствы фашысты. Пасля вайны, калі да рэлігіі адносіліся дрэнна, кіраўніцтва сельскага савета атрымала загад крыж вывезці і знішчыць.



Репозиторий ГрГМУ

Калі жанчына пад'ехала да таго месца, дзе раней быў крыж, конь стаў на дыбы і іржаў, вырываючы лейцы з рук жанчыны. Яна, спалоханая, паглядзела ў бок, дзе раней знаходзіўся крыж, і ўбачыла Матку Боску Балесну ў чорнай вопратцы.

Праз некаторы час на сходзе аднавяскоўцаў было вырашана паставіць на тым месцы новы крыж. Гэта месца з'яўляецца пэўным месцам паломніцтва і веры.

Такім чынам, звяртаючыся да пытання, чым для рэспандэнтаў з'яўляецца крыж, аналізуючы гісторыю ўстанаўлення крыжа ў вёсцы Самаравічы, можна зрабіць вывад – крыж з'яўляецца сімвалам веры. Пра гэта сведчаць паклонныя крыжы, крыжы ў вёсках і гарадах, таксама крыжы на месцах трагедый і катастроф. Найбольш распаўсюдзілася менавіта такое значэнне крыжа ў параўнанні з яго значэннем у якасці прадмета ў мастацтве [2].


Літаратура:

1. Крыж як старажытны сімвал чалавецтва. [Электронны рэсурс]. – Рэжым доступу: https://oroik.by/kryzh-yak-starazhytny-simval-chalavectva/?ysclid=m1xtrm3bwy949293065. – Дата доступу: 06.10.2024.
2. Традыцыі ўшанаваццця крыжа беларусамі ў канцы XIX ст. [Электронны рэсурс]. – Рэжым доступу: https://media.catholic.by/nv/n5/art15.htm. – Дата доступу: 06.10.2024.


## СЭРВІСЫ WEB 2.0 ЯК СРОДАК ФАРМІРАВАННЯ ПАТРЫЯТЫЧНАЙ КУЛЬТУРЫ ВУЧНЯЎ НА І СТУПЕНІ АГУЛЬНАЙ СЯРЭДНЯЙ АДУКАЦЫІ


**Сячко П. В.**

Гродзенскі дзяржаўны ўніверсітэт імя Янкі Купалы
г. Гродна, Рэспубліка Беларусь
Навуковы кіраўнік – канд. філал. навук, дац. Лапкоўская А. М.


Духоўнае багацце народа адлюстроўваецца ў яго нацыянальных звычаях і нацыяналнай культуры. Беражліва захоўваючы спадчыну мінулага, суверэнная Беларусь закладвае новыя традыцыі і фарміруе патрыятычную культуру маладых людзей. У беларускіх нацыянальных традыцыях нашы лепшыя дасягненні і якасці: міласэрнасць і прыязнасць, душэўная шчодрасць і гатоўнасць падзяліцца ўсім, што маем. Беларусь сёння дэманструе ўсяму свету, як трэба адстойваць свой суверэнітэт [1].

Выхаванне любові да роднай беларускай мовы, беларускай культуры і спадчыны – важная задача, якая стаіць перад настаўнікамі на І ступені агульнай сярэдняй адукацыі. У сучасным грамадстве немалаважнае значэнне займае фарміраванне патрыятычнай культуры вучняў, патрыятычнай свядомасці

Репозиторий ГрГМУ